***Саітава Валянціна Іванаўна***
Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў

# ПУБЛІКАЦЫІ ГРАМАДСКІХ КРАЯЗНАЎЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ЯК ПРАДСТАЎЛЕННЕ РЭГІЯНАЛЬНАЙ АДМЕТНАСЦІ ВА ЎМОВАХ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ КУЛЬТУРЫ

*У артыкуле разглядаюцца асноўныя напрамкі дзейнасці грамадскіх краязнаўчых арганізацый, вынікам якой з'яўляюцца шматлікія выдавецкія праекты: публікацыі па прапагандзе ведаў аб сваёй краіне, вобласці, горадзе.*

*This article discusses the activity of non-profit local history organizations and their numerous publishing projects.*

Інфармацыйнае грамадства, ці грамадства ведаў, асноўнымі праявамі якога выступаюць глабальная інфармацыйная інфраструктура, глабальная інфармацыйная супермагістраль і глабальны фонд ведаў, стварае мноства праблем, у ліку якіх зберажэнне і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

распаўсюджванне ведаў аб малых тэрыторыях, уключэнне іх у сацыяльна-камунікацыйны працэс, дзе гэтыя веды становяцца аб'ектам пазнавальнай патрэбнасці асобных грамадзян, супольнасцей і грамадства ў планетарным вымярэнні. Комплексныя веды аб малых тэрыторыях генерыруюцца краязнаўчым рухам. Краязнаўчы рух у любой краіне праяўляецца як складана структураваная з'ява, якая ахоплівае мноства формаў, суб'ектаў, мэт, зместавых напрамкаў і інш. У наш час, як і раней, у краязнаўчых ведах сінтэзуюцца вынікі пазнавальнай дзейнасці розных індывідуальных і калектыўных, прафесійных і аматарскіх суб'ектаў краязнаўчага руху. Самі краязнаўчыя веды нясуць рысы ведаў сацыяльных, навуковых і звычайных, сістэмных і сітуатыўных і інш. Асноўным сродкам уключэння краязнаўчых ведаў у сацыяльна-камунікатыўны працэс і забеспячэння іх даступнасці з'яўляецца публікацыя.

У патоку публікацый па краязнаўстве адметнае месца належыць грамадскім арганізацыям, чыя прысутнасць у сучасным краязнаўчым руху ў Беларусі сведчыць аб кансалідацыі лепшых інтэлектуальных сіл з мэтамі даследаваць, захаваць і актуалізаваць веды аб малых тэрыторыях.

Нягледзячы на некалькі няўдалых спроб стварыць краязнаўчае таварыства як грамадскую арганізацыю ў маштабах рэспублікі[1], шматлікія самастойныя краязнаўчыя арганізацыі вядуць сваю работу згодна з пастаўленымі мэтамі і задачамі, даследуюць актуальную для рэгіёнаў тэматыку. Магчыма дыферэнцыраваць грамадскія арганізацыі па некалькіх групах з улікам асаблівасцей іх дзейнасці:

– краязнаўчыя навуковыя і навукова-асветныя таварыствы, дзейнасць якіх прысвечана даследаванню і папулярызацыі ведаў аб пэўнай тэрыторыі. Аб'ядноўваюць пераважна вучоных, спецыялістаў і даследчыкаў-аматараў пэўнага рэгіёну. Да ліку такіх арганізацый адносіцца, напрыклад, Заходнепалескае навуковакраязнаўчае таварыства «Загароддзе», Тураўскае навукова-асвет-

---

[1] Фарміраванне ўнутранай арганізацыйнай структуры Беларускага краязнаўчага таварыства (1989–1994 гг.), як і іншыя напрамкі дзейнасці, прыпынілася пасля заўчаснай смерці старшыні таварыства Г.А. Каханоўскага.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нае таварыства, Віцебскі краязнаўчы фонд імя А. Сапунова, Гарацкае краязнаўчае таварыства «Бацькаўшчына» і інш. У Гродзенскай вобласці шматлікія краязнаўчыя арганізацыі аб'ядналіся ў Гродзенскую абласную краязнаўчую асацыяцыю;

– краязнаўчыя арганізацыі пры ўстановах. Дзейнасць іх перш за ўсё служыць папулярызацыі ведаў аб самой установе і рэгіёне;

– краязнаўчыя арганізацыі, прафіляваныя па канкрэтным змесце актуальнай для рэгіёну тэматыцы даследаванняў. Да іх ліку адносяцца гісторыка-краязнаўчыя цэнтры, клубы і іншыя, напрыклад ваенна-гістарычны цэнтр у Смаргоні, дзейнасць якога прысвечана падзеям Першай сусветнай вайны.

Хаця некаторыя краязнаўчыя арганізацыі па тых ці іншых прычынах спынілі сваю работу, але дзейнасць лепшых працягваецца і ўзнікаюць новыя таварыствы.

Краязнаўства стала адным з напрамкаў дзейнасці такіх вядомых грамадскіх арганізацый, як Беларускі фонд культуры, Беларускае дабраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны і інш. Краязнаўчы аспект дзейнасці ярка праяўляецца ў нацыянальна-культурных таварыствах, якія аб'ядноўваюць прадстаўнікоў пэўнага этнасу (палякаў, татар, літоўцаў, украінцаў) і даследчыкаў этнічнай гісторыі. Гэтыя арганізацыі праводзяць разнастайную культурна-масавую, асветніцкую і даследчую работу, наладзілі друкаванне на этнічных мовах і аб этнасах.

Многія грамадскія краязнаўчыя арганізацыі імкнуцца да рэалізацыі выдавецкіх праектаў. Самымі значнымі з іх з'яўляюцца выданні зборнікаў матэрыялаў навуковых канферэнцый, краязнаўчых часопісаў, газет, кніг, публікацыі на сайтах. Так, навукова-краязнаўчае таварыства «Загароддзе», зарэгістраванае пры НАН Беларусі, вынікі навуковых семінараў адлюстроўвае ў нумараваным зборніку «Загароддзе». Друкуюцца ў іх вучоныя розных галін ведаў, настаўнікі і іншыя даследчыкі, аб'яднаныя інтарэсам да заходняга Палесся. Грамадскае аб'яднанне «Тураўскае навукова-асветнае таварыства» выпускае зборнік «Тураўшчына». Актыўную выдавецкую дзейнасць праводзіць Віцебскі краязнаўчы фонд імя А. Сапунова, дзякуючы якому выйшлі ў свет кнігі, прысвечаныя выдатным мясцовым краязнаўцам. У выданні «Браслаўскіх

сшыткаў» прымала ўдзел Браслаўскае краязнаўчае таварыства імя О. Хедэмана.

За два апошнія дзесяцігоддзі краязнаўчыя арганізацыі набылі вялікі вопыт правядзення навуковых канферэнцый, у т. л. міжнародных, і публікацыі іх вынікаў. Гэта, бясспрэчна, інавацыйны вопыт сучаснага беларускага краязнаўства, які значна ўзбагаціў веды аб многіх беларускіх рэгіёнах (Браславе, Воранаве, Гомелі, Гродне, Зэльве, Карэлічах, Краснаполлі, Магілёве, Навагрудку, Рэчыцы, Рагачове, Полацку, Слоніме і інш.). Даклады, выстаўкі, экскурсіі, прэзентацыі, якія праводзяцца падчас правядзення краязнаўчых канферэнцый і чытанняў, зносіны з мясцовым насельніцтвам дазваляюць шырока распаўсюдзіць вынікі новых даследаванняў, вярнуць з небыцця многія імёны, спрыяюць пераадоленню састарэлых стэрэатыпаў, абуджаюць інтарэс да мясцовай гісторыі, узмацняюць нацыянальную свядомасць і патрыятызм. Пад уплывам навуковых адкрыццяў грамадскасць многіх рэгіёнаў дабілася ўстанаўлення памятных дошак і помнікаў выдатным землякам, ушанавання знакавых гістарычных падзей. Краязнаўчыя канферэнцыі і чытанні, як і публікацыя іх матэрыялаў, здзяйсняюцца грамадскімі краязнаўчымі арганізацыямі ва ўзаемадзеянні з мясцовымі адміністрацыйнымі органамі пры дапамозе ВНУ, краязнаўчых музеяў, бібліятэк і інш. Так, выпускі зборнікаў «Краязнаўчыя запіскі» ўбачылі свет дзякуючы супрацоўніцтву ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкома, Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, Гродзенскай абласной краязнаўчай асацыяцыі, Гродзенскага гарадскога савета аховы помнікаў гісторыі і культуры. Дзейсная падтрымка мясцовымі ўладамі навуковых выданняў характарызуе актуальнасць краязнаўчых ведаў для мэт рэгіянальнага развіцця.

Вельмі значную ролю ў публікацыі новых матэрыялаў адыгрываюць музейныя ўстановы, ВНУ, інстытуты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Выпуск зборнікаў «Загароддзе» і «Тураўшчына» краязнаўчыя арганізацыі здзяйсняюць разам з Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі. Зборнік «Віцебскі сшытак» выпускаўся Віцебскім абласным краязнаўчым музеем і Віцебскім абласным краязнаўчым аб’яднаннем. Зборнікам матэрыялаў навуковых канферэнцый і чытанняў уласціва навуковая і крыніцазнаўчая навізна, выкарыстанне аўтарамі арсенала метадалагічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сродкаў, сістэмнасць падыходу да аб'ектаў даследаванняў, аўтарытэтнасць надзейнай асновы будучых навуковых пошукаў. Гэтыя выданні істотна ўзбагацілі склад публікацый, прысвечаных невялікім тэрыторыям і населеным пунктам Беларусі. Прагноз іх далейшага развіцця самы станоўчы. У апошнія гады мясцовыя выканаўчыя камітэты, навуковыя ўстановы і ВНУ праяўляюць не меншую зацікаўленасць у правядзенні навуковых краязнаўчых канферэнцый і чытанняў, чым краязнаўчыя арганізацыі, што сведчыць аб правільным кірунку і формах супрацоўніцтва.

Новыя веды адлюстроўваюць і краязнаўчыя кнігі, выпускам якіх займаюцца асобныя краязнаўчыя арганізацыі. Так, Віцебскі краязнаўчы фонд імя А.П. Сапунова выпусціў творы сучасных краязнаўцаў А. Падліпскага, А. Лісава, В. Рогач, М. Рыўкіна («Краязнавец Мікалай Каспяровіч», «Летапісец Віцебшчыны: А.П. Сапуноў», «Доски, берегущие память», «Наш вечный дом: из истории еврейских кладбищ в Витебске» і інш.).

Выпуск часопісаў, газет, бюлетэняў, якія б аператыўна асвятлялі навіны краязнаўчага руху, падзеі мясцовага жыцця, вынікі даследчай працы, быў і застаецца адным з найбольш прывабных праектаў дзейнасці краязнаўчых арганізацый. Недахоп патрэбных рэсурсаў часта спыняе выпуск толькі распачатых выданняў, таму падтрымаць які-небудзь працяглы тэрмін выхаду перыядычнага органа, надаць сучасны выгляд з пункту гледжання паліграфічнага афармлення краязнаўчыя арганізацыі звычайна не могуць. Прыкладаў доўгатэрміновага выпуску рэгіянальных перыядычных органаў не шмат, напрыклад, краязнаўцы Гродзеншчыны ў 2000 г. пачалі выпуск «Краязнаўчай газеты», дзякуючы якой асвятляліся навіны і дасягненні краязнаўчага руху.

Лепшыя ўмовы для выпуску перыядычных выданняў маюць грамадскія арганізацыі, для якіх краязнаўства з'яўляецца адным з напрамкаў дзейнасці. Сярод іх нацыянальна-культурныя таварыствы і рэгіянальныя структуры Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. Некаторыя з іх ствараюць органы краязнаўчага характару. Так, у г. Лідзе (Гродзенская вобласць) адным з галоўным цэнтраў краязнаўчага руху і друку працяглы час выпускаюцца два перыядычныя выданні высокай якасці. Так, у 1990 г. лідскае аддзяленне Саюза палякаў Беларусі адрадзіла выданне часопіса



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Ziemia Lidzka» («Лідская зямля») – аднаго з выдатных краязнаўчых перыядычных выданняў у Беларусі ў міжваенны перыяд). У сучасным часопісе мясцовыя краязнаўцы, даследчыкі лідскай зямлі, ураджэнцы краю і іх нашчадкі (якія пражываюць у Польшчы і іншых краінах) у артыкулах і ўспамінах усебакова адлюстроўваюць гістарычнае мінулае, у т. л. малавядомыя падзеі, лёсы сотняў лідчан. Адным з лепшых стаў краязнаўчы часопіс «Лідскі летапісец» (заснавальнік – старшы навуковы супрацоўнік Лідскага гістарычна-мастацкага музея В. Сліўкін). У часопісе змяшчаюцца паведамленні пра бягучыя падзеі Лідчыны, гістарычны каляндар рэгіёну, шмат даследчых матэрыялаў. Напрыклад, В. Сліўкін апублікаваў каштоўныя працы, прысвечаныя падзеям Вялікай Айчыннай вайны ў Лідзе. На старонках часопіса адлюстравана многа біяграфічных матэрыялаў, прысвечаных як знакамітым землякам, так і звычайным людзям, якія сталі ўдзельнікамі важных гістарычных падзей. «Лідскі летапісец» – багата ілюстраванае выданне, прычым многія фатаграфіі і іншыя матэрыялы друкуюцца ўпершыню.

Патрэбнасць у перыядычным органе, дзе краязнаўцы маглі б асвятляць і абмяркоўваць напрамкі і вынікі сваёй дзейнасці, які быў бы цікавым і даступным для ўсяго насельніцтва, цалкам усведамлялася лідэрамі сучаснага краязнаўчага руху. Таму выдатнай падзеяй і актуальным праектам стала выданне «Краязнаўчай газеты» (выходзіць з 2003 г.)[2] па ініцыятыве Беларускага фонду культуры (БФК), сярод напрамкаў якога вызначана і краязнаўчая дзейнасць. Галоўным рэдактарам газеты з'яўляецца старшыня БФК Уладзімір Гілеп. У склад рэдакцыі ўвайшлі вядомыя сучасныя краязнаўцы А. Бутэвіч, В. Скалабан, А. Мальдзіс, В. Рагойша, А. Грыцкевіч, А. Карлюкевіч, В. Хурсік і інш. У раздзелах і рубрыках газеты ўсебакова адлюстроўваюцца новыя дасягненні краязнаўства. Узбагачаючы веды аб мінулым розных мясцін Беларусі, перыядычнае выданне асвятляе сучасныя формы краязнаўства, арганізуе абмен думкамі. Рубрыка «Малая краязнаўчая энцыклапедыя» знаёміць з паняццямі, неабходнымі пачаткоўцам у края-

---

[2] Краязнаўчая газета / заснав. грамад. аб'яд-нем «Беларускі фонд культуры» і інш. – Мінск, 2003.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знаўстве, аматарам краязнаўства. Рубрыка «Сучасныя беларускія краязнаўцы» – гэта матэрыялы да слоўніка дзеячаў краязнаўства. Газета прадстаўляе таксама цікавыя і унікальныя ілюстрацыйныя матэрыялы.

Павялічваецца значнасць публікацый краязнаўчых арганізацый у інтэрнэт-прасторы. Вялікая колькасць публікацый сяброў краязнаўчых арганізацый размешчана на мностве сайтаў. Свой сайт маюць адзінкавыя краязнаўчыя арганізацыі – таварыства «Загароддзе», Гомельская маладзёжная краязнаўчая грамадская арганізацыя «Талака». Сайт «Талакі» добра распрацаваны, ахоплівае матэрыялы пачынаючы з устаўных дакументаў да сучасных праектаў і праграм, бягучых падзей, усебакова раскрывае дзейнасць арганізацыі, змяшчае багаты і унікальны ілюстрацыйны матэрыял[3]. Сайты грамадскіх краязнаўчых арганізацый прадстаўляюць тэксты і выяўленчыя матэрыялы, прысвечаныя гістарычнаму мінуламу і сучаснасці краю. Падсумоўваючы вынікі, можна зрабіць выснову аб актуальнасці публікацый краязнаўчых арганізацый, іх станоўчай ролі ў захаванні і распаўсюджванні новых навуковых ведаў, папулярызацыі краязнаўчых ведаў як на рэгіянальным узроўні і ўзроўні краіны, так і ў сусветнай інфармацыйнай прасторы. З'явіліся выдатныя навуковыя выданні, перыядычныя органы, публікацыі на сайтах, на чарзе – стварэнне відэа- і аўдыёпрадукцый[4]. Гэтыя напрамкі перспектыўныя: трансліруючы веды аб рэгіёнах у сусветную інфармацыйную прастору, публікацыі краязнаўчых арганізацый садзейнічаюць іх выкарыстанню ў сацыяльных працэсах (навуковага пазнання, адукацыі, фарміравання светапогляду і інш.), з'яўляюцца адмысловымі «пунктамі ўваходу» ў глабальны фонд ведаў, інфармацыі і культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[3] http://nashkraj.info/content/view/307/1/

[4] Напрыклад, «Талакой» створаны 80 аўдыёкасет і 5 відыакасет з запісамі танцаў і абрадаў розных мясцін Гомельшчыны.